Каждый город уникален как по объективным критериям, так и по атмосфере, сформированной историей и подкрепляемой социумом с неповторимым менталитетом. Как бы не пытались архитекторы начиная с античности и до наших дней, не существует такого плана города, который бы одинаково работал в Европе и Азии или даже в пределах одной страны. Потому правила должны направлять творческие замыслы проектанта, а не ограничивать или исключать его из процесса.

## БИБЛИОГРАФИЧЕСКИЕ ССЫЛКИ


1. *Фреско Ж.* «Проект Венера» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://designing-the-future.org/the-venus-project-faq/. – Дата доступа: 05.12.2021
2. *Burckhardt L.* Rethinking man-made environments. Vienna & NY : Springer, 2012.
3. *Krippendorff K.* The semantic turn: a new foundation for design». London * NY ; Taylor&Francis : CRC Press. 2006.
4. *Banerjee T.* Companion to Urban Design. NY : Routledge, 2011.


# КУЛЬТУРНАЯ АНТРАПАЛОГІЯ ДЫЗАЙНА

# CULTURAL ANTHROPOLOGY OF DESIGN


А. Д. Крывалап
A. Krivolap

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў
Мінск, Беларусь
Belarusian State University of Culture and Arts
Minsk, Republic of Belarus
*e-mail: email2krivolap@gmail.com*


---


Артыкул прысвечаны разгляду магчымасцей выкарыстання канцэпцыі антрапалогіі дызайну для разумення сучаснай культуры ў межах культуралогіі. Антрапалогія дызайну разглядаецца ў кантэксце канвергенцыі дзейнасці даследчыкаў антраполагаў і дызайнераў практыкаў. Прадстаўлены варыянты разумення антрапалогіі дызайну, якія былі прапанаваны такімі даследчыкамі як А. Кларк, К. Мілер, К. Мэрфі, Дж. Маркус і інш. Артыкул не спрабуе вырашыць усе пытанні звязаныя з прабле-

май антрапалогіі дызайну, а хутчэй з’яўляецца разгорнутымі ўводзінамі ў разуменне праблемы канвергенцыі ў сферы культуры.

*Ключавыя словы:* антрапалогія дызайну; крэсла; культурная антрапалогія; этнаграфія.

The article focuses on the possibilities of using the concept of anthropology of design to understand contemporary culture within cultural studies. The anthropology of design is viewed in the context of the convergence of activities of research anthropologists and designer practitioners. Variants of understanding the anthropology of design presented by such researchers as A. Clarke, Ch. Miller, K. Murphy, G. Marcus et al. The article does not attempt to address all issues related to the problem of design anthropology, but rather is a comprehensive introduction to understanding the problem of convergence in culture.

*Keywords:* anthropology of design; chair; cultural anthropology; ethnography.

---

Як можна падступіцца да дызайну з дапамогай антрапалогіі? Наогул, ці магчыма знайсці нейкія кропкі і скрыжаванні у якіх дызайн як з’ява культуры можа разглядацца таксама і як вынік антрапалагічнай дзейнасці?

Для большай нагляднасці звернемся да такой штодзённай рэчы як звычайнае крэсла. Магчыма, што вы чытаеце гэтыя радкі ў той час як сядзіце на зручным (спадзяюся) крэсле. Безумоўна, гісторыя дызайну ведае выбітныя прыклады крэслаў, якi на сённяшні дзень з’яўляюцца «іконамі» стылю і дасканаласці дызайнерскай думкі і творчасці. Гэта і *«Red and Blue chair»* Герыта Рытвельда, і крэсла *«Wassilly» Марсэля Брэйера*, і крэсла *«Westport» Томаса Лі*, якое стала штуршком для стварэння класічнага крэсла *«Adirondack» Ірвінам Уолпінам*. Зразумела, што гэты спіс магчыма працягваць далей. Аднак, варта паспрабаваць паглядзець на гісторыю развіцця крэслаў з іншага пункту гледжання, калі ў цэнтры разважанняў будзе не храналагічны пералік дат, калі з’явілася тая ці іншая мадэль, а якім чынам наяўнасць (адсутнасць) пэўных прадметаў мэблі дазваляюць лепш зразумець то ці іншае грамадства. Для культурнай антрапалогіі вядомы шматлікія прыклады, калі праз валоданне пэўнымі артэфактамі падкрэсліваецца сацыяльны статус уласніка. І гэта працуе не толькі на ўзроўні тубыльскіх плямёнаў, але і сучасным грамадстве XXI ст., калі залаты гадзіннік на руцэ патрэбны не толькі і не столькі для таго каб паказваць бягучы час, але перш за ўсё, імкнецца да стварэння адпаведнага вобразу свайго ўласніка.

Вернемся да крэслаў ці іншай мэблі, якая таксама можа выконвацца не толькі ўтылітарныя функцыі, але і падкрэсліваць сацыяльную няроўнасць. «Крэслы, зэдлікі і лаўкі выкарыстоўваліся ў Егіпце і Месапатаміі па меншай меры 5000 гадоў таму. У той час як абывацелі і рабы сядзелі на зэдліках або лавах, цары, святары і іншыя ўзвышаныя асобы ў Старажытным Егіпце выкарыстоўвалі крэслы. Кітайцы пачалі выкарыстоўваць крэслы даволі позна ў сваёй гісторыі: 2000 гадоў таму яны сядзелі на падлозе, як гэта робяць японцы і карэйцы сёння. У Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі крэслы ніколі не сталі прадметамі агульнага карыстання» [1, p. 125]. Вынаходніцтва мэблі было часткай канструявання сацыяльнай няроўнасці. Калі замест прыродных цялесных практык ствараюцца новыя. Калі пытанне зручнасці і камфорту атрымлівае не біялагічнае, а сацыяльнае і культурнае гучанне. Культурныя ўяўленні пра зручнае і нязручнае, як і пра прыгожае і жудаснае, з’яўляюцца вынікам развіцця культуры. Таму з’яўленне крэслаў, зэдлікаў, лавак, фатэляў і іншых прадметаў мэблі каб мець магчымасць сядзець – гэта не задавальненне нейкай біялагічнай патрэбы, бо сядзець можна і на кукішках, але наўпрост стварэнне адпаведнай культурным нормам і ўяўленням прылады, якая забяспечыць падтрымку нашаму целу. Ключавой тут будзе культурна дэтэрмінаваны характар позы чалавечага цела. Мы навучаемся як правільна сядзець, гэтак жа як і вучымся хадзіць. І гэта не столькі пытанне фізіялогіі, колькі засваення культурных норм. Тое, што сёння завецца цялеснымі практыкамі, штодзённыя позы нашага цела – гэта і «з’яўляецца адным з самым цікавых пытанняў ва ўсім спектры звычаяў» [2, p. 728]. Атрымліваецца, што ў працэсе даследавання культурнай разнастайнасці для антрапалогіі непазбежным будуць пытанні пра незвычайныя практыкі і тэхнікі цела, а таксама і ў дачыненні да адпаведных прылад, якія і робяць гэтыя практыкі магчымымі. Такім чынам, дызайн штодзённых побытавых рэчаў – гэта не толькі пра эстэтыку і функцыі, зручнасць і камфорт, але і пра канструяванне лакальных культурных каштоўнасцей і нормаў, што маюць непасрэднае дачыненне да падпарадкавання цялеснасці.

Мэта гэтага артыкула паказаць магчымасці культурнай антрапалогіі для інтэрпрэтацыі дызайну як аб’екта даследавання сучаснай культуры.

Шукаючы магчымыя сувязі паміж антрапалогіяй і дызайнам, магчыма знайсці выказванні даследчыкаў, што «ў апошнія дзесяцігоддзі ў культуры дызайну адбыўся сейсмічны зрух, у выніку якога «карыстальнікі» і метады антрапалагічнага даследавання сталі ключавымі сродкамі рас-

шыфроўкі нюансаў аб’ектна-суб’ектных адносін. Але антрапалагічны аб’ект, няхай гэта будзе малаток *Халяйна*, іншыцкае сховішча *Папанэка* ці сялянская прылада Суперстудыё, ужо даўно стаў каханай музай крытычна настроеных дызайнераў» [3, p. 86]. Што ў чарговы раз паказвае, якія чынам антрапалогіі можа не абмяжоўвацца месцам акадэмічнай дысцыпліны, але і быць эфектыўнай і практыка-арыентаванай.

Магчыма, што адной з галоўных адметнасцей антрапалогіі дызайну можа быць «прамы акцэнт на карыснасці, і сапраўды, неабходнасць этнаграфічных метадаў для гуманістычнага тыпу дызайну, які ўлічвае жывыя культурныя міры, населеныя праектаванымі рэчамі і іх карыстальнікамі» [4, p. 252]. Як антрапалогія з дапамогай этнаграфічных метадаў імкнецца растлумачыць карыснасць і сэнс ціх ці іншых артэфактаў, так і дызайн прагне карыснасці, а не ўпрыгожвання дзеля прыгажосці.

Антрапалогія дызайну – гэта не проста сітуацыя, калі дызайнеры ўлічваюць пажаданні будучых карыстальнікаў ці звяртаюць увагу на лакальныя культурныя адметнасці, як гэта неаднаразова рабілася антраполагамі падчас этнаграфічных экспедыцый. Замест гэтага неабходна актыўнае ўзаемадзеянне з практыкамі, бачанне будучыні, надзённымі пытаннямі дня і кантэкстам выкарыстання распрацоўваемых рэчаў. «Антрапалогія дызайну мае сваім аб›ектам не толькі мір і практыкі карыстальнікаў, але і практыкі і кантэксты самога працэсу дызайну. Яна дзейнічае на скрыжаванні практык і кантэкстаў выкарыстання і праектавання» [5, p. 187].

Дызайн і антрапалогія не проста адлюстроўваюць, але актыўна ўзаемадзейнічаюць з практыкамі і перспектывамі адзін аднаго. Дызайн антрапалагічных палявых работ – гэта сумесныя намаганні паміж дызайнерамі і антраполагамі, якія вывучаюць, канцэптуалізуюць і эксперыментуюць з патэнцыяльнымі адносінамі паміж людзьмі, практыкамі і рэчамі, што патрабуе сталай рэфлексіі і пераасэнсавання. Вынікам гэта можа быць не проста перадача дэталёвых апісанняў цяперашніх практык карыстальнікаў у якасці сыравіны для ўяўлення дызайнераў аб іх будучых прадуктах, а пра «вывучэнне і працу з канцэптуалізацыямі і перабудовай адносін паміж людзьмі і рэчамі, каб павысіць творчы патэнцыял дызайнераў і карыстальнікаў» [5, p. 188].

Такім чынам антрапалогія дызайну – гэта «новая трансдысцыплінарная вобласць, якая характарызуецца падыходам, які аб’ядноўвае антрапалагічныя метады, тэорыю, рамкі і крытыку з прынцыпамі і практыкамі праектавання для вырашэння ўсё больш шырокага кола складаных

праблем на сістэмным узроўні, з якімі сутыкаюцца сучасныя грамадства, інстытуты і арганізацыі» [6, p. 8–9]. Але гэта трансдысцыплінарнасць часам з'яўляецца дадатковай перашкодай для разумення ўнікальнасці дадзенай з'явы, бо часам гэта пачынае нагадваць творчы хаос усяго і адразу. «Антрапалогія дызайну з'яўляецца часткай шырокага руху дысцыплінарнай канвергенцыі, які стварае патэнцыял беспарадку, парушаючы дысцыплінарныя межы і новы парадак праз з'яўленне гібрыдызаваных абласцей вытворчасці ведаў» [6, p. 99].

Пры гэтым антрапалогію дызайну не варта блытаць з этнаграфічным дызайнам, якія імкнецца стылізаваць адценні этнічнасці і ўпісаць іх кантэкст сучаснай культуры спажывання. «Антрапалогія дызайну з'яўляецца антытэзай гэтага адлюстравання этнаграфіі ў сілу яе пастаяннай засяроджвання на дынамічных, пачатковых момантах як на гарніле, у якім наспяваюць трансфармацыйныя змены» [6, p. 100].

Напэўна, варта паказаць магчымыя агульныя падыходны і памкненні дызайну і культурнай антрапалогіі, каб лепей зразумець гэта новастворaны праект антрапалогіі дызайну. Калі месца сутыкнення і ўзаемадзеяння дызайну і антрапалогіі з'яўляецца этнаграфія – «складаны спосаб узаемадзеяння, які ляжыць у аснове антрапалогіі і які апынуўся гэтак карысным для шматлікіх абласцей дызайну. Этнаграфія – гэта абавязковая наяўнасць поля, як метадалагічнага так эмпірычнага» [4, p. 254]. Для антрапалогіі этнаграфія – гэта адзін з магчымых метадаў збору эмпірычнай інфармацыі. Для дызайну этнаграфія – гэта магчымасць убачыць і зразумець практыку карыстальнікаў падчас узаемадзеяння з аб'ектам дызайну.

Таксама даследчыкі антрапалогія дызайну вылучаюць некалькі прынцыповых агульных момантаў, якія дазваляюць зразумець магчымасці падобнай канвергенцыі. Абапіраючыся на тэкст *К. Мэрфі* і *Дж. Маркуса* сфармулюем сем базавых момантаў [4, p. 257–261]:

1. Дизайн і этнаграфія існуюць як прадукт і працэс. Фактычна яны адначасова могуць быць вынікам працы і ў самой працай, якая імкнецца да гэтага выніку.
2. Дызайн і этнаграфія спасылаюцца не толькі на прадукцыю, якую вырабляюць дызайнеры ці збіраюць этнографы, але і на складаныя працэсы, з дапамогай якіх гэтая прадукцыя вырабляецца – працэсы, якія амаль цалкам схаваныя за іх спажывецкай формай. Выніковыя прадукты атрымліваюць большую ўвагу ад тых, хто іх спажывае, чым увесь працэс іх стварэння і размеркавання.

3. Дызайн і этнаграфія арыентаваны на даследаванні . Навучанне як дызайну, так і этнаграфіі ў значнай ступені грунтуецца на культываванні разумення таго, што было раней, у тым ліку імён і твораў уплывовых папярэднікаў, але разам з гэтым назіраецца імкненне да вывучэння сучаснасці і найбольш актуальных практык.
4. Дызайн і этнаграфія з трывогай арыентаваны на людзей. Што рабіць калі карыстальнікі парушаюць распрацаваныя правілы абыходжання са створанымі рэчамі? Ці вінаваты людзі, якіх даследуюць антрапалагі, што іх паводзіны не ўпісваюцца ў наяўныя тэорыі і тлумачэнні? Так ці інакш, але ўзаемадзеянне паміж людзьмі, прама ці ўскосна, вядзе да нечаканых і непрадказальных наступстваў.
5. Дызайн і этнаграфія служаць большаму, чым толькі самі рэчы. На эмпірычным узроўні антрапалагі і дызайнеры працуюць з адносна не глабальнымі мэтамі – стварыць зручнае крэсла або растлумачыць пэўны рытуал – яны заўсёды звязаны з чымсьці большым, з нейкай звышзадачай. Дызайн, які сёння глыбока ўкараніўся ў капіталістычнай сістэме вытворчасці, распрацоўваецца не дзеля высокага мастацтва, а аглядаючыся на патрэбы спажыўцоў.
6. Дызайн і этнаграфія прадугледжваюць рэфлексіўнасць падчас дзейнасці. Выкарыстання нататніка для фіксацыі ўласных эмоцый, думак і адчуванняў для антрапалогіі сёння з'яўляецца стандартам якасці. Гэтак жа як і для дызайнераў ёсць магчымасць паказаць і расказаць якім чынам яны зрабілі той ці іншы праект.
7. Дызайн і этнаграфія грунтуюцца на розных педагагічных падыходах і інфраструктуры. З аднаго боку, дызайнерская адукацыя вельмі структуравана, звычайна будуецца вакол выканання канкрэтных практычных праектаў. З іншага, фактычна не існуе аднаго агульнапрынятага метаду выкладання антрапалогіі і этнаграфіі.

Падсумоўваючы, варта адзначыць, што паспяховыя антрапалагічныя даследаванні непазбежным чынам будуць закранаць пытанні штодзённасці, а значыць і разнастайныя пабытавыя рэчы, якія па вызначэнні з'яўляюцца вынікам дзейнасці дызайнераў. І ў той жа час, для антрапалогіі менавіта гэтыя ж самыя рэчы будуць вельмі прывабнымі і цікавымі артэфактамі, з дапамогай якіх будзе магчыма патлумачыць адметнасці той ці іншай культуры.

Антрапалогія дызайну, як трансдысцыплінарны праект дазваляе разглядаць дызайн як у кантэксце культурных практык штодзённасці, так

і ў непарыўнай сувязі з пэўнымі лакальнымі культурам, з усімі іх традыцыямі і каштоўнасцямі.

Магчыма, культурная антрапалогія сёння з'яўляецца не толькі і не столькі крыніцай натхнення для дызайнераў, якія блукаюць у пошуках аўтэнтычнасці ці этнічнасці, але і нешта накшталт зваротнай сувязі для спажыўцоў і карыстальнікаў.

Антрапалогія дызайну – гэта не проста спроба ў чарговы раз вынайсці кола, прыдумаць ровар ці унікальнае крэсла з пэўным аздабленнем лакальнай культуры. Хутчэй антрапалогія дызайну – гэта магчымасць уключыць як вынікі, так і сам працэс дызайну ў сферу даследаванняў культурнай антрапалогіі. Калі даследчыкаў цікавіць не толькі гісторыя з'яўлення пэўных артэфактаў, але і сацыяльна-культурныя наступствы іх выкарыстання для грамадства.

### БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Hewes G.* The anthropology of posture. // Scientific American. 1957. Vol. 196. №. 2. P. 122–133.
2. *Kreober A. L.* Handbook of the Indians of California. Washington : Govt. Printing Office, 1925.
3. *Clarke A. J.* The Anthropological Object in Design: From Victor Papanek to Superstudio // Design anthropology: object culture in the 21st century Vienna : Springer, 2011. P. 74–87.
4. *Murphy K.* Epilogue: Ethnography and Design, Ethnography in Design Ethnography by Design. // Design Anthropology: Theory and Practice / ed. by Gunn W., Otto T., Smith R. London : Bloomsbury Academic, 2013. P. 251–268.
5. *Kjærsgaard M.* Anthropological Fieldwork and Designing Potentials. // Design and Anthropology / ed. by W Gunn, J. Donovan Farnham : Ashgate Publishing, 2012. P. 177–191.
6. *Miller Ch.* Design + anthropology: converging pathways in anthropology and design. New York : Routledge, 2017.

4\. *Murphy K.* Epilogue: Ethnography and Design, Ethnography in Design Ethnography by Design. // Design Anthropology: Theory and Practice / ed. by Gunn W., Otto T., Smith R. London : Bloomsbury Academic, 2013. P. 251–268.